Министерство образования Республики Беларусь

Учреждение образования «Барановичский государственный университет»

Федеральное государственное бюджетное образовательное учреждение высшего образования
«Тамбовский государственный университет имени Г. Р. Державина»

# СПЕЦИАЛИСТ XXI ВЕКА: ПСИХОЛОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКАЯ КУЛЬТУРА И ПРОФЕССИОНАЛЬНАЯ КОМПЕТЕНТНОСТЬ

Сборник материалов V Международной
научно-практической конференции

(Барановичи, 20—22 октября 2016 года)

Репозиторий БарГУ

Барановичи
БарГУ
2016

УДК 001(063)

Включены материалы докладов V Международной научно-практической конференции «Специалист XXI века: психолого-педагогическая культура и профессиональная компетентность» по актуальным проблемам следующих научных дисциплин и направлений: психология, педагогика, филология, лингвистика и методика преподавания иностранных языков, человек в обществе, организация здоровьесбережения, обучение, воспитание и развитие дошкольников.

Адресовано преподавателям и студентам учреждений высшего образования, магистрантам, аспирантам.

Редакционная коллегия:

А. В. Никишова (гл. ред.), А. В. Прадун, Н. Ф. Захарченя (отв. секретари),
Е. А. Клещёва, Е. Ф. Нестер, К. С. Тристень, А. В. Демидович, Е. И. Белая, О. Н. Фенчук,
И. В. Пинюта, А. А. Савко

Рецензенты:

доктор психологических наук, профессор Я. Л. Коломинский,
кандидат филологических наук, доцент, доцент кафедры русской и зарубежной литературы учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» О. Е. Панькова

Репозиторий БарГУ

**ISBN 978-985-498-740-8**

© БарГУ, 2016

Важным методическим приёмом представляется сопоставление на уроке оригинального и фикрайтерского произведений и, кроме того, сравнение нескольких (оптимальный вариант — двух) фанфиков между собой. Это позволит не только развить навыки сравнительного анализа, но и поможет обобщить уже известную информацию об оригинальном тексте и выявить в нём не замеченные ранее элементы. Также сопоставление нескольких фанф-текстов будет способствовать пониманию индивидуальных особенностей и стиля автора.

На уроке также возможна постановка проблемы развития языка Интернета с последующим поиском лингвистических особенностей текстов сетевой литературы в представленном материале. Если класс имеет достаточно высокий уровень знаний, учителем также может быть предложено задание выявить и сформулировать тенденции в развитии русского языка, что вовлечёт детей, которые будут выступать в роли учёных, в научно-исследовательский процесс.

**Заключение.** Данный материал следует изучать вместе с другими видами современного искусства или же в рамках серии уроков, посвящённых современной литературе. Первый вариант нам представляется наиболее подходящим, поскольку фанфикшен интегрирует в себе достижения компьютерных возможностей и представляет собой отдельно развивающуюся субкультуру.

УДК 378.147

**Т. М. Пучынская**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

## ДЗЕЛАВАЯ ГУЛЬНЯ ЯК АКТЫЎНЫ МЕТАД НАВУЧАННЯ БУДУЧЫХ НАСТАЎНІКАЎ ЛІТАРАТУРЫ

**Уводзіны.** Адной з асноўных мэт прафесійнай падрыхтоўкі настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры з'яўляецца фарміраванне практыкаарыентаванай кампетэнтнасці [1, с. 6], якая прадугледжвае набліжэнне студэнтаў да рэальных умоў будучай прафесійнай дзейнасці. Адаптацыя да працы ў якасці настаўніка літаратуры пройдзе хутчэй, калі студэнт на вучэбных занятках стане ўдзельнікам дзелавых гульняў. Іх асаблівасцю з'яўляецца мадэляванне педагагічных сітуацый, максімальна набліжаных да рэальных.

**Асноўная частка.** Сутнасць дзелавых гульняў па педагогіцы даволі шырока асветлена ў навуковай літаратуры. Аднак апісанне канкрэтнай дысцыплінарнай практыкі, у прыватнасці, навучанне студэнтаў методыцы выкладання беларускай літаратуры, з'яўляецца актуальным пытаннем.

Шматлікія вызначэнні паняцця «гульня» («педагагічная гульня», «дзелавая гульня», «вучэбная дзелавая гульня») у педагогіцы вышэйшай школы маюць агульныя рысы. Так, Р. С. Піонава лічыць, што «педагагічная гульня — гэта інтэграцыйны метад, які імітуе рашэнне педагагічных задач, што ўзнікаюць у рэальных педагагічных сітуацыях…» [2]. Даследчык У. А. Трайнеў адзначае: «Вучэбная дзелавая гульня — гэта мэтанакіравана сканструяваная мадэль якога-небудзь рэальнага працэсу, што імітуе прафесійную дзейнасць і накіравана на фарміраванне і замацаванне прафесійных уменняў і навыкаў» [3].

Вучэбныя дзелавыя гульні — гэта актыўны метад навучання, паколькі ён дазваляе павысіць матываванасць студэнтаў да набыцця будучай прафесіі, іх самастойнасць у рашэнні практычных задач [4]. Дыялогавыя зносіны, устойлівая актыўнасць кожнага студэнта, развіццё самастойнасці, уменне працаваць калектыўна — якасці дзелавой гульні, якія, безумоўна, сведчаць пра яе эфектыўнасць як актыўнага метаду навучання.

Правядзенне дзелавых гульняў на занятках па методыцы выкладання беларускай літаратуры паказала, што дадзены метад навучання дазваляе фарміраваць шэраг акадэмічных, сацыяльна-асобасных, прафесійных кампетэнцый, вызначаных у адукацыйным стандарце вышэйшай адукацыі для будучых настаўнікаў літаратуры [5]. Найбольш важныя з іх наступныя: умець прымяняць базавыя навукова-практычныя веды для рашэння тэарэтычных і практычных задач; валодаць здольнасцю да міжасабовых камунікацый; умець працаваць у камандзе, кіраваць вучэбна-пазнавальнай і вучэбна-даследчай дзейнасцю школьнікаў; выкарыстоўваць аптымальныя метады, формы і сродкі навучання; арганізоўваць і праводзіць вучэбныя заняткі розных відаў і форм; ажыццяўляць прафесійную самаадукацыю і самавыхаванне з мэтай удасканалення прафесійнай дзейнасці [6].

Дзелавыя гульні можна праводзіць на працягу ўсяго перыяду вывучэння дысцыпліны, пачынаючы з асобных імітацыйных практыкаванняў і заканчваючы арганізацыяй комплекснай дзелавой гульні. Правядзенню дзелавых гульняў папярэднічае прагляд відэазапісаў урокаў літаратуры або іх фрагментаў з наступным аналізам. Так студэнты паступова набліжаюцца да рэальнай школьнай практыкі.

Непасрэднае выкарыстанне гульні рэкамендуецца пачынаць з укаранення яе асобных элементаў. Напрыклад, студэнты складаюць прафесіяграму настаўніка літаратуры, вызначаюць, якімі якасцямі ён павінен валодаць «у вачах» калег, вучняў, бацькоў. Будучым настаўнікам неабходна таксама назваць тыя асаблівасці, якія ў іх, як яны мяркуюць, ужо сфарміраваны. Гэта дае магчымасць у пэўнай ступені вызначыць узровень прафесійнай зарыентаванасці студэнтаў.

Паступова заданні ўскладняюцца. Выкладчык прапануе студэнтам мадэль пэўнай педагагічнай сітуацыі, якую неабходна вырашыць. Прыклады так званых імітацыйных практыкаванняў могуць быць самыя розныя.

© Пучынская Т. М., 2016



Репозиторий БарГУ

Гульня «Канфліктны вучань» праводзіцца ў парах. «Настаўнік» прапануе «вучню» выканаць заданне, апошні выказвае нязгоду. Выкладчык і студэнты, якія прысутнічаюць у аўдыторыі, ацэньваюць, ці змог «настаўнік» вырашыць канфліктную сітуацыю і пабудаваць гутарку з «вучнем» належным чынам. Імітацыйныя практыкаванні вызначаюцца праблемнасцю, адносна невялікімі затратамі часу, вырашэннем канкрэтных педагагічных задач.

Эфектыўнасць дзелавой гульні як актыўнага метаду навучання больш выразна праяўляецца ў працэсе правядзення фрагментаў урокаў. Студэнты, напрыклад, павінны прадэманстраваць, на якім этапе заняткаў і якімі метадамі і прыёмамі фарміруюцца тэарэтыка-літаратурныя веды вучняў. Кожная група атрымлівае заданне паказаць, як, напрыклад, фарміруецца паняцце пра кампазіцыю эпічнага твора, развіваецца паняцце пра вобразна-выяўленчыя сродкі ў лірычным творы, арганізуецца праца з крытычным артыкулам і г. д. Асэнсаванне дапушчаных пралікаў у працэсе гульні пабуджае будучых настаўнікаў да самаўдасканалення.

Правядзенне фрагментаў урокаў дазваляе фарміраваць і замацоўваць уменні і навыкі, звязаныя перш за ўсё з прафесійнымі кампетэнцыямі будучых настаўнікаў літаратуры. У дадзеным выпадку гульня мае навучальны характар. Як правіла, студэнты атрымліваюць папярэдняе заданне: падрыхтаваць фрагмент урока па пэўнай тэме, прадумаць сістэму пытанняў і заданняў, абгрунтаваць выбар метадаў і прыёмаў выкладання.

Асаблівую цікавасць у студэнтаў выклікаюць гульні, што стымулююць творчае мысленне. Напрыклад, заданне навучыць школьнікаў выразна чытаць адзін і той жа лірычны твор з рознай інтанацыяй заўсёды актывізуе дзейнасць студэнтаў. Дзелавыя гульні ствараюць сітуацыю, калі кампетэнцыі, заяўленыя ў адукацыйным стандарце спецыяльнасці, фарміруюцца ва ўмовах, максімальна набліжаных да рэальных.

Рэгулярна ўкараняючы гульнёвыя сітуацыі, можна падрыхтавацца і да больш працяглай гульні — правядзення ўрока літаратуры. Кожная група выбірае, з якім літаратурным матэрыялам будзе працаваць: эпас, лірыка або драма. Каб пазбегнуць выпадковасці ў выбары студэнтамі формы працы, неабходна канкрэтызаваць заданні. Напрыклад, адна група павінна правесці ўрок з выкарыстаннем міжпрадметных або ўнутрыпрадметных сувязей, другая — прадэманстраваць інавацыйныя метады і прыёмы, трэцяя — абавязкова ўкараніць заданні на развіццё вуснага і пісьмовага маўлення.

На практычных занятках неабходна ў першую чаргу выпрацаваць уменне рэалізоўваць традыцыйныя падыходы да арганізацыі ўрока літаратуры. Важна навучыць будучых настаўнікаў прытрымлівацца рэкамендаваных метадыстамі схем, алгарытмаў, паслядоўнасці аналізу твораў. Трэба таксама паказаць студэнтам каштоўнасць метадычных «знаходак», асабістага педагагічнага пошуку настаўніка, яго здольнасці прыняць нестандартнае рашэнне ў дасягненні мэты ўрока.

Як актыўны метад навучання гульня дазваляе фарміраваць уменне вырашаць праблемы калектыўна, на аснове дыялогу. Каб правесці ўрок, студэнтам неабходна ўзгадніць паміж сабой яго тэму, форму правядзення, выбар метадаў і прыёмаў выкладання, нарэшце, «размеркаваць ролі». Важна ўзгадніць шэраг пытанняў з тымі студэнтамі, якія будуць працаваць у якасці вучняў, даручыць ім выканаць апераджальныя заданні, перачытаць мастацкія творы, якія будуць аналізавацца.

Правядзенне цэласнага ўрока літаратуры дазваляе мадэляваць пошук рашэння студэнтамі адукацыйных, развіваючых і выхаваўчых задач. Пры гэтым развіваюцца ўменні і навыкі, неабходныя для штодзённай працы ў якасці настаўніка літаратуры: фарміраванне выразнага чытання школьнікаў, правядзенне гутаркі з класам, аналіз твораў розных жанраў, выкарыстанне тэхнічных сродкаў навучання, нагляднасці, рэалізацыя міжпрадметных і ўнутрыпрадметных сувязей, развіццё вуснага і пісьмовага маўлення, укараненне інавацыйных метадаў і прыёмаў выкладання і інш.

У працэсе арганізацыі дзелавых гульняў узнікае пытанне, ці варта выкладчыку рабіць заўвагі па ходу правядзення ўрока адносна дапушчаных студэнтамі пралікаў. Мяркуем, што на этапе гульні выкладчык павінен быць назіральнікам або экспертам. Толькі пасля яе завяршэння неабходна аналізаваць арганізацыю ўрока літаратуры. Празмерная актыўнасць выкладчыка зніжае самастойнасць студэнтаў у рашэнні пастаўленых задач. Часам, аднак, ёсць неабходнасць адразу карэкціраваць дзеянні студэнтаў, напрыклад, нагадаць пра неабходнасць выпраўляць памылкі ў маўленні вучняў.

На занятках па методыцы выкладання беларускай літаратуры намі практыкуецца партнёрская гульня, калі кожная з груп адпрацоўвае прафесійныя ўменні і навыкі. Часам выкарыстоўваецца гульня ў выглядзе спаборніцтва каманд. Так, можна вызначыць пераможцаў у арганізацыі чытання мастацкага тэксту па ролях. Перавага гульні як актыўнага метаду навучання заключаецца ў тым, што выкладчык актывізуе дзейнасць усіх студэнтаў, у тым ліку і мала падрыхтаваных. Кожны ўдзельнік гульні адчувае сваю далучанасць да сітуацыі, якая імітуе педагагічную дзейнасць. Эфектыўным з'яўляецца «ўваходжанне» ў ролю не толькі настаўніка, але і вучня. Студэнты ацэньваюць «моцныя і слабыя бакі» прапанаванай методыкі, адзначаюць, якія пытанні і заданні настаўніка выклікаюць цікавасць у школьнікаў.

У працэсе арганізацыі дзелавой гульні важна стварыць умовы, максімальна набліжаныя да школьнай практыкі. Таму студэнты павінны правесці асобныя ўрокі літаратуры ў рэальным часе. Вынікі праходжання студэнтамі педагагічнай практыкі ў школе сведчаць пра цяжкасці ў размеркаванні часу на кожны этап урока. Ролевая гульня без абмежавання часу дазваляе фарміраваць і замацоўваць адпаведныя навыкі.

Дзелавая гульня завяршаецца падвядзеннем яе вынікаў. Неабходна выслухаць меркаванне эксперта, у якасці якога выступае выкладчык або запрошаны са школы настаўнік літаратуры. Эксперт не толькі ацэньвае дзейнасць групы ў цэлым, але і каменціруе паспяховасць асобных удзельнікаў гульні. Важна таксама, каб выказаліся самі студэнты, правялі рэфлексію, вызначылі ўласныя дасягненні і памылкі.

Апытванне студэнтаў пацвердзіла, наколькі важна праводзіць комплексную дзелавую гульню. З 36 апытаных студэнтаў 32 (88,9%) адназначна аддалі перавагу правядзенню ўрока літаратуры ў рэальным часе. Свой выбар

Репозиторий БарГУ

студэнты тлумачылі тым, што цэласны ўрок дазваляе ўбачыць увесь працэс арганізацыі вучэбных заняткаў, пачынаючы з папярэдняй падрыхтоўкі і заканчваючы аналізам.

Укараненне гульні як метаду навучання сведчыць, што яе эфектыўнасць залежыць ад такіх фактараў, як наяўнасць у студэнтаў тэарэтычных ведаў па методыцы выкладання беларускай літаратуры, ступень валодання імі літаратурным матэрыялам, узровень развіцця творчага педагагічнага мыслення, матываванасць да набыцця прафесіі, здольнасць да самааналізу і рэфлексіі. Рэалізацыя дадзенага метаду залежыць таксама ад узроўню майстэрства яе арганізатара, выкладчыка, які павінен дасканала прадумаць усе этапы гульні, стварыць псіхалагічны камфорт на занятках.

Безумоўна, дзелавая гульня не вырашае ўсіх метадычных праблем, звязаных з прафесійнай падрыхтоўкай будучага спецыяліста, настаўніка літаратуры. Дадзены метад навучання мае свае «слабыя бакі»: стандартнасць педагагічных дзеянняў, абстрактнасць змадэляваных сітуацый, неэканомнасць часу, калі гульня імітуе цэлы ўрок. Тым не менш выкарыстанне гульні як аспекта выкладання дысцыпліны дазваляе фарміраваць практыкаарыентаваную кампетэнтнасць студэнтаў, у значнай ступені падрыхтаваць іх да пастаяннай працы ў школе. З 36 апытаных студэнтаў 33 (94,4%) адзначылі эфектыўнасць гульнёвай вучэбнай дзейнасці, тлумачачы яе значнасць набыццём практычных навыкаў, больш якаснай падрыхтоўкай да праходжання педагагічнай практыкі ў школе.

**Заключэнне.** Каштоўнасць гульні як актыўнага метаду навучання бачыцца перш за ўсё ў глыбокім асэнсаванні будучымі настаўнікамі літаратуры эфектыўнасці сваіх практычных дзеянняў, ва ўстойлівасці і працягласці іх актыўнасці на занятках.

**Спіс цытуемых крыніц**


1. Образовательный стандарт высшего образования. ОСВО 1-02 03 01-2013. Высшее образование. Первая ступень. Специальность 1-02 03 01 Белорусский язык и литература. Квалификация Преподаватель : утв. М-вом образования Респ. Беларусь 30.08.13. Минск : М-во образования Респ. Беларусь. 26 с..
2. Пионова Р. С. Педагогика высшей школы [Электронный ресурс] : учеб. пособие. Минск : Университетское, 2002. URL: https://www.Studfiles.ru>previes/1806274 (дата обращения: 29.07.2016).
3. Трайнев, В. А. Учебные деловые игры в педагогике, экономике, управлении, маркетинге, социологии, психологии: методология и практика проведения [Электронный ресурс] : учеб. пособие для студентов вузов, обучающихся по специальности 033400 «Педагогика». М. : Гуманитар. изд. центр ВЛАДОС, 2005. URL: https://www.static.my-shop. > product/pdf/97/962612.pdf. (дата обращения: 07.2016).
4. Там же.
5. Образовательный стандарт высшего образования. С. 6.
6. Там же. С. 7—8.


УДК 81'373.47(476)

**А. У. Сямёнава, М. В. Качурка**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 7 г. Баранавічы», Баранавічы*

## МОЎНАЯ НОРМА ЯК ПРАДМЕТ НАВУКОВАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

**Уводзіны**. Перабудова не толькі сістэмы адукацыі, але і ўсяго грамадства Рэспублікі Беларусь, фарміраванне высокай свядомасці кожнага яе насельніка немагчымы без высокай культуры мыслення. А яно, як вядома, непарыўна звязана з мовай. Па гэтай прычыне праблема культуры маўлення сродкаў масавай інфармацыі, у прыватнасці мовы публіцыстыкі, з'яўляецца адной з найбольш актуальных і шырока абмяркоўваецца ў тэарэтычнай і практычнай лінгвістыцы (прама або ўскосна разглядаецца ў работах М. В. Абабуркі, Г. У. Арашонкавай, А. А. Каўруса, Г. В. Кузьмянковай, В. П. Лемцюговай, І. Я. Лепешава, А. І. Наркевіча, А. І. Падлужнага, П. У. Сцяцко, М. Я. Цікоцкага і інш.).

Паколькі публіцыстычнае маўленне звернута да шматлікай і разнастайнай аўдыторыі, яно павінна быць агульнапрынятым і агульназразумелым, гэта значыць адпавядаць нормам беларускай літаратурнай мовы. Аднак публіцыстыка аб'ектыўна не можа поўнасцю захоўваць усталяваныя нормы літаратурнай мовы, бо час ад узнікнення ў маўленчай практыцы новага слова да замацавання ў слоўніках становіцца перыядам яго засваення, а гэта выклікае непазбежнае сутыкненне тэорыі і практыкі. З прычыны гэтага існуе супярэчлівасць паміж неабходнасцю захавання норм сучаснай беларускай літаратурнай мовы, што спрыяе павышэнню культуры маўлення, і неабходнасцю адхіленняў ад існуючых норм у сувязі з творчым развіццём беларускай мовы. Праблема да канца не вырашана і патрабуе далейшай распрацоўкі.

Варта заўважыць, што абвостраная ўвага грамадства да пытання аб правілах (нормах) літаратурнага выразу выявілася яшчэ ў першай палове ХІХ стагоддзя (В. У. Вінаградаў, 1938, 1959; А. І. Гаршкоў, 1969 і інш.). У цяперашні час норма як цэнтральнае паняцце культуры маўлення і кадыфікацыі мовы набыла асабліва сур'ёзнае навуковае і грамадскае значэнне. У паняцце «норма» ўкладваецца ўсё больш важкі лінгвістычны сэнс. Норма тлумачыцца як адзін з моўных узроўняў (Ю. Сцяпанаў, 1966), як сацыяльна-гістарычны атрыбут любой мовы (В. І. Кодухаў, 1974) [1, с. 36].

© Сямёнава А. У., Качурка М. В., 2016

Рэпазіторый БарДУ